Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.

ПАДКАЗКІ АД ПРЫРОДЫ

У апошнія гады надвор'е вельмі непрадказальнае, таму тэрміны пасеву культурных раслін лепш за ўсё вызначаць па самой прыродзе.

Пачатак вясны агароднікa — дзень, калі зацвітае падбел. Ад гэтага дня даўней і адлічвалі час для пачатку веснавых работ.

На 11-ы дзень бялілі дрэвы, рыхлілі зямлю, зграбалі лістоту, саджалі маладыя фруктовыя дрэвы.

На 14-ы дзень пачыналі араць зямлю і рыхтаваць градкі.

На 23-і дзень можна было саджаць раннюю гародніну: цыбулю, буракі, рэпу, пятрушку, моркву, гарох, радыску, рэдзьку.

Праз 30 дзён саджалі раннюю бульбу. Але вось калі падбел зацвітае раней за Звеставанне, то пасадку бульбы лепш адкласці да цвіцення чаромхі. Наогул, для бульбы існуе сваё праверанае стагоддзямі правіла: яе саджаюць не раней, чым распусціцца лісце на бярозе, але не пазней, чым зацвітае чаромха.

Існуюць і іншыя прыродныя падказкі агароднікам.

• Як толькі пакрываецца пухнатымі суквеццямі ляшчына, можна пачынаць сеяць у адкрыты грунт радыску і ранні шпінат — самыя падыходныя для гэтага часу культуры. З кветак можна сеяць календулу, васількі і мак.

• Цвіценне фарзіцыі і фіялак кажа пра тое, што надышоў час для пасеву моркві і пятрушкі, кветак гадэцыі і іберысу.

• З'яўленне пухнатых камячкоў вярбы і квітнеючыя нарцысы азначаюць, што трэба сеяць салату, раннюю рэдзьку, капусту кальрабі, савойскую і чырвонакачанную. З кветак у гэты час саджаюць стакроткі, лубін, рэзеду, аднагадовы флёкс, духмяны гарошак. А праз некалькі дзён можна саджаць гарох і бурак.

• Як толькі распусціліся лісточкі ў дуба, значыць, замаразкаў больш не будзе і надышоў час для пасеву цеплалюбных культур: фасолі, кабачкоў, агуркоў, гарбузовых.

• Зацвілі рабіна і бэз — можна смела высейваць агуркі і расаду таматаў, перцаў, баклажанаў, фізалісу.

ЯНЫ ДАПАМОГУЦЬ ЗРАБІЦЬ ПАВЕТРА Ў ДОМЕ ЧЫСТЫМ

Англійскі плюшч. Гэтая расліна — не толькі чэмпіён сярод пакаёвых раслін па паглынанні вуглякіслага газу. Хітры плюшч мае ў сваім арсенале яшчэ адну важную і рэдкую ўласцівасць: з'яўляецца натуральным сарбентам і забірае з паветра солі цяжкіх металаў, таксіны і фармальдэгід. Асабліва карысна абзавесціся такім хатнім улюбёнцам тым, хто жыве на ніжніх паверхах дамоў уздоўж вялікіх магістраляў, і тым, хто працуе ў паўпадвальных памяшканнях.

Бамбукавая пальма. Калі англійскі плюшч — стварэнне даволі капрызнае ў плане палівання і падкормкі, то бамбукавая пальма (яна ж хамедарэя) будзе ўдзячная вам толькі за тое, што вы паставіце яе ў такое месца, куды хоць бы на некалькі гадзін у дзень дабярэцца сонейка. І паліваць часта не трэба. Затое паветра яна чысціць выдатна. Смела стаўце яе каля камп'ютара — яна зменшыць шкоду электрамагнітнага выпраменьвання.

Спатыфілум. Гэтая арыстакратычна прыгожая расліна не пагрэбуе самай чорнай працай у вашым доме. Яна будзе неміласэрна змагацца з прамысловымі і побытавымі таксінамі. Ёй пад сілу «паглынуць» пары ацэтону, бензолу, розных відаў спіртоў, аміяку. Ідэальны варыянт — запусціць спатыфілум (як кошку) у новую кватэру пасля рамонту. Ніводная пакаёвая расліна не можа параўнацца з ёй у вайне з хімікатамі.

Пальма Лэдзі. А вось гэтая вытанчаная «дама», у адрозненне ад шматлікіх іншых раслін, не толькі чысціць паветра ад шкодных прымесяў, але і шчодра насычае яго важнымі мінераламі і солямі, якія спрыяльна дзейнічаюць на дыхальную сістэму чалавека. Так што завесці яе будзе не лішнім у доме, насельнікі якога пакутуюць ад хранічных бронхалёгачных праблем, бранхіяльнай астмы, сардэчных хвароб. А яшчэ пальма Лэдзі выдатна супакойвае нервы. Спецыялісты раяць ставіць яе побач з крэслам, дзе вы прывыклі адпачываць з кніжкай. У ЗША працаўнікі фірмаў часта скідваюцца на куплю гэтай расліны ў кабінет босу, каб ён паменш раздражняўся.

Фікус. Непатрабавальная «бабуліна» расліна вельмі эфектыўна чысціць паветра і пры гэтым асвяжае яго. І практычна не выклікае алергічных рэакцый. Так што яе можна спакойна ставіць побач з ложкам і ў дзіцячым пакоі.

■ Інфарм-укол

А ПАД НАКРЫЎКАЙ — БАТУЛІЗМ

Няякасныя марынаваныя грыбы, агуркі, мясныя кансервы, каўбасы, рыба, выробленыя ў хатніх умовах, здольныя выклікаць батулізм — самае цяжкае захворванне сярод харчовых атручэнняў. Яно атакуе цэнтральную нервовую сістэму, выклікае параліч і парэз мышцаў.

Паводле слоў **урача-гігіеніста аддзялення гігіены харчавання Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юрыя ГАРАНЮКА,** споры батулізму шырока распаўсюджаныя ў навакольным асяроддзі і вельмі ўстойлівыя да розных фізічных і хімічных уздзеянняў. Яны не гінуць падчас гатавання і пры «хатняй стэрылізацыі». Павараная соль і воцат здольныя, хіба, прытармазіць прарастанне спораў. Верны спосаб іх вынішчэння магчымы толькі ў прамысловых умовах.

Як праяўляецца батулізм?

Агульнай слабасцю, галаўным болем. Могуць быць ваніты і панос. Праз некалькі гадзін з'яўляюцца неўралагічныя праявы: расстройства зроку, параліч мяккага паднябення, языка, глоткі, гартані, парушаецца глытанне і маўленне.

Існуе толькі адзін спосаб лячэння батулізму — увядзенне супрацьбатулінічнай сывараткі. Чым раней яна будзе ўведзена, тым лепш.

Рабі так

✓ Лепш нарыхтоўваць прадукты пра запас з дапамогай сушкі, салення, замочвання. Кансервацыя прадуктаў у хатніх умовах у шклянкі з герметычнымі накрыўкамі — добрыя ўмовы для росту і размнажэння анаэроба.

✓ Строга разлічвайце дазіроўку: солі — 10%, воцату — 2%. Пастэрызацыя — не менш за 30-40 хвілін.

✓ Захоўвайце кансервацыю пры тэмпературы не вышэй за 8 градусаў.

✓ Нарыхтоўка мясных прадуктаў. Туша не павінна забруджвацца зямлёй, гноем і змесцівам кішэчніка падчас раздзелкі. Кумпяк соляць у холадзе. Перад ежай мясныя прадукты рэкамендуецца падвяргаць цеплавой апрацоўцы.

✓ Нарыхтоўка рыбы. Выпатрашыць, прамыць праточнай вадой. Саліць пры тэмпературы 4-5 градусаў. Халодны пасол не толькі прадухіляе размнажэнне бактэрый, але і затрымлівае таксінаўтварэнне палачкі батулізму. Пасля салення, вялення, вэнджання захоўваць у холадзе. Ужываць рыбу пасля салення можна праз некалькі дзён, каб соль паспела пранікнуць унутр тушкі.

✓ Не набывайце кансервы з рук.

✓ Бамбаж накрыўкі — сведчанне непрыдатнасці прадукту.

Сёлета ад батулізму пацярпелі 4 чалавекі (летась — 34). Ёсць і адзінкавыя лятальныя зыходы.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Факт

ШЫШКІ ЗДЗІВІЛІ ЎРАДЖАЕМ

Лясгасы нарыхтавалі амаль 750 тон шышак сасны, з якіх будзе атрымана насенне для стварэння новых лясоў. Напрыклад, летась удалося сабраць 320,7 тоны шышак, у 2012 годзе — 441,7 тоны, паведаміла прэс-сакратар Міністэрства лясной гаспадаркі Ружэна Навіцкая. Сабраны ўраджай шышак не толькі задаволіць уласную трохгадовую патрэбу лясгасаў у насенні для вырошчвання пасадачнага матэрыялу, але і дасць магчымасць вырасціць дадатковыя сеянцы на экспарт. Дарэчы, з сабраных 750 тон шышак 141 тона з'яўляецца селекцыйнай. Самы вялікі ўраджай атрымалі лясгасы Гомельскай вобласці, сабраўшы 184 тоны шышак. 168 тон нарыхтавалі гаспадаркі Мінскай вобласці, 136 тон — лясгасы Магілёўскай вобласці. На Брэстчыне паклалі ў «актыў» 100,5 тоны шышак, на Віцебшчыне — каля 88 тон, на Гомельшчыне — 72 тоны.

Дарэчы, сёлета з кожнай тоны шышак у Рэспубліканскім лясным селекцыйна-насеннаводчым цэнтры выходзіць 1,4 працэнта якаснага насення, у лесанасенных цэхах лясгасаў — 1,2 працэнта. Звычайна ж выходзіў толькі адзін працэнт.

Сяргей РАСОЛЬКА

Яўгена ПЯСЕЦКАГА фота слова

Да зімы не маю веры,
Бо яна з краёў далёкіх
Шле то «Евы», то «Хаўеры» —
Зімавеевы сурокі.

Хай сабе цыклон шалее —
Згодна з вечным запаветам,
На Купалавай алеі
Прарастаюць першацветы.

Дзе снягі вясну чакаюць,
Сакавіцкім светлым часам
Першацветы прарастаюць
І астатніх клічуць разам.

Сквер Янкі Купалы ў Мінску, на маю думку, адзначаны самой прыродай. Незвычайная энергетыка гэтага кавалачка зямлі сярод гарадскога асфальту дае моц першым сакавіцкім кветкам. Побач з помнікам Песняру тут штогод з'яўляюцца першыя зялёныя пасланцы вясны, а набярэжная Свіслачы збірае ўсіх птушак — і тых, хто тут зімаваў, і тых, хто вярнуўся здалёку.